УДК 002.2(476)
**КАВАЛЕЎСКАЯ Н.А.**, студэнт
Навуковы кіраўнік **БАЎШЫНА Ю.У.**, ст. выкладчык
УА «Віцебская ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны», г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь

# ФРАНЦЫСК СКАРЫНА – БЕЛАРУСКІ І ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКІ ПЕРШАДРУКАР

Францыск Скарына ўвайшоў у гісторыю нашай краіны як першадрукар, кнігавыдавец, перакладчык, паэт, вучоны, асветнік і гуманіст. З асветніцкай дзейнасці Скарыны, яго перакладу на родную мову Бібліі пачалася эпоха беларускага Адраджэння.

Дакладная дата нараджэння першадрукара невядомая, але лічаць, што нарадзіўся Ф. Скарына каля 1490 года ў Полацку. Першапачатковую адукацыю атрымаў дома. У 1504 годзе пастуніў у Кракаўскі ўніверсітэт на факультэт «вольных мастацтваў», а праз два гады атрымаў вучоную ступень бакалаўра філасофіі. Пасля вучыўся ў Падуанскім ўніверсітэце, дзе паспяхова здаў экзамены на ступень доктара «лекарскіх навук».

Сваю выдавецкую дзейнасць Ф. Скарына пачаў у Празе, дзе першым сярод усходніх славян у жніўні 1517 года выдаў «Псалтыр», куды змясціў псалмы, па якіх у тыя часы вучыліся пісьменству. З 1517 па 1519 год Скарына надрукаваў кірылаўскімі літарамі на старабеларускай мове 23 кнігі Бібліі. Кожная кніга ўпрыгожвалася вялікай колькасцю гравюр, уключала прадмовы і пасляслоўі, у якіх ён выказваў свае грамадскія і асветніцкія погляды. Разнастайныя гравюры і застаўкі пазначаны своеасаблівым гербам – сонца, напалову закрытае месяцам. На палях кніг змяшчаліся тлумачэнні ўстарэлых царкоўнаславянскіх слоў. У прадмовах да кніг Бібліі паэт друкаваў свае вершы. Кнігі Ф. Скарыны можна аднесці да лепшых узораў усходнееўрапейскага кнігадруку таго часу.

У 20-я гады XVI стагоддзя Ф. Скарына пераехаў у Вільню, дзе ў 1522 годзе ў доме Якуба Бабіча заснаваў друкарню і выдаў «Малую падарожную кніжыцу», у якой змясціў разнастайныя астранамічныя і каляндарныя звесткі. Кніга прызначалася для гандляроў, якія шмат падарожнічалі. У 1525 годзе выйшла яшчэ адна кніга Ф. Скарыны «Апостал» – дзеянні і пасланні святых апосталаў. У 30-я гады, лічаць даследчыкі, першадрукару зноў прыйшлося пераехаць у Прагу, дзе да канца сваіх дзён ён жыў і працаваў садоўнікам-батанікам пры каралеўскім двары. Нялёгкае жыццё было ў нашага земляка. Пражыў ён усяго 45 гадоў, з якіх доўгі час вымушаны быў жыць і працаваць удалечыні ад Радзімы. Дакладная дата смерці і месца пахавання невядомыя. Мяркуюць, што памёр Францыск Скарына каля 1551 года ў Празе.

Выдавецкая дзейнасць Ф. Скарыны падштурхнула беларусаў І. Фёдарава і П. Мсціслаўца выдаць першую кнігу ў Маскве ў 1564 годзе і ў Львове ў 1574 годзе.

РЕПОЗИТОРИЙ УО ВГАВМ